# ИСТОРИЯ

**С. Я. Новікаў**

## ”БЕЛАРУСКІ АСВЕНЦІМ” – ЭТАПЫ НАВУКОВАГА ДАСЛЕДАВАННЯ ГІСТОРЫІ ТРАСЦЯНЦА Ў БЕЛАРУСКАЙ І ГЕРМАНСКАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ

В статье освещаются методологические аспекты изучения истории одного из тягчайших нацистских преступлений на белорусской земле в годы Великой Отечественной войны – Тростенца. Определяются проблемные поля в начавшейся в последнее время общеевропейской научной, музейно-туристической и информационной реконструкции исторических событий, включении этого места трагедии в сферу современной культуры памяти. Исследование основывается на новых документальных источниках и историографических фактах, используется метод источниковедческой компаративистики.

У 2017 г. спаўняецца 75 гадоў з той пары, калі ў раёне вёсак Вялікі і Малы Трасцянец амаль адначасова са стварэннем працоўнага лагера для прымусовага ўтрымання грамадзянскага насельніцтва пачаўся адлік ахвяр у трагічным спісе масавага знішчэння людзей, у тым ліку яўрэяў Беларусі, Аўстрыі, Германіі і Чэхаславакіі, удзельнікаў партызанскай і падпольнай барацьбы, савецкіх ваеннапалонных. Аднак да гэтага часу маштабная трагедыя, звязаная з гібеллю 206,5 тысяч чалавек, не стала аб’ектам спецыяльнага ўсебаковага даследавання ў беларускай гістарычнай навуцы. Нашай мэтай з’яўляецца спроба рэканструкцыі гістарычных падзей на падставе не толькі новых дакументальных крыніц і малавядомых фактаў, але і сучасных метадалагічных напрацовак, перш-наперш – метаду крыніцазнаўчай і гістарыяграфічнай кампаратывістыкі.

У айчыннай гістарычнай навуцы замацавана абагульняючая назва «Трасцянец», якая датычыцца трагічных падзей, што адбыліся каля вёсак Малы і Вялікі Трасцянец пад Мінскам. Уведзенае ў канцы 1980-х гадоў у шырокі ўжытак беларускім гісторыкам Ф. П. Раманоўскім навуковае паняцце «Трасцянецкі лагер смерці» [1, с. 590] застаецца па цяперашні час вызначальным пры характарыстыцы таго, што ў ім адбывалася ў гады Вялікай Айчыннай вайны, але пакідае адкрытым важнае пытанне аб навуковай класіфікацыі гэтага месца масавай трагедыі грамадзянскага насельніцтва з Беларусі і іншых еўрапейскіх краін. Мае сэнс заўважыць, што ў сваёй доктарскай дысертацыі, паспяхова абароненай у 1974 г., але не апублікаванай у якасці асобнага навуковага выдання, Ф. П. Раманоўскі ўжывае ў дачыненні да гэтай тэрыторыі зусім іншую назву – «канцлагер смерці Трасцянец» (тут і далей пераклад наш. – *С. Н.*) [2, л. 92]. Беларускі даследчык не дае патрэбнай у гэтай сувязі навуковай класіфікацыі месца, на той час ужо добра вядомага пасля адкрыцця мемарыяльнага комплексу

«Хатынь», дзе ў адной з мемарыяльных ніш у «Сцяне жалобы» згадваўся Трасцянец з агульнай лічбай ахвяр колькасцю ў 206,5 тыс. чалавек. Апроч таго, застаўся па-за межамі вывучэння важны на той час дакумент – «Акт мінскай абласной камісіі» ад 13 жніўня 1944 г., уведзены ў навуковы зварот у сярэдзіне 1960-х гадоў [3, с. 224–226], але пакінуты без крытычнага аналізу прафесійнымі гісторыкамі.

Цяперашняму беларускаму чытачу варта нагадаць асноўныя палажэнні, замацаваныя ў айчыннай літаратуры адносна «лагера смерці Трасцянец», які на той час, паводле В. П. Раманоўскага, знаходзіўся на 11-м кіламетры шашы Мінск–Магілёў. Лагер быў створаны ў лістападзе 1941 г. каля вёскі Трасцянец Мінскага раёна для масавага знішчэння савецкіх грамадзян і ваеннапалонных, палітычных вязняў з еўрапейскіх турмаў і лагераў Аўстрыі, Германіі, Польшчы, Францыі і Чэхаславакіі [1, с. 590]. Масавыя расстрэлы праводзіліся ва ўрочышчы Благаўшчына (да кастрычніка 1943 г. загублена каля 150 тыс. чалавек), затым ва ўрочышчы Шашкоўка (знішчана больш за 50 тыс. чалавек), дзе была створана спецыяльная яма-печ. Дастаўленыя ў канцы чэрвеня 1944 г. ахвяры з мінскіх турмаў і лагераў (каля 6,5 тыс. чалавек) былі спалены ў калгаснай адрыне в. Малы Трасцянец і на штабелі дроў побач з ёй. Усяго ў Трасцянецкім лагеры смерці, які па колькасці ахвяр стаіць на 4-м месцы пасля Асвенціма, Майданека і Трэблінкі, знішчана 206,5 тыс. чалавек [1, с. 590].

У навукова-папулярным выданні «Экскурсія ў Трасцянец», аўтарам якога з'яўлялася супрацоўніца Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны А. Г. Ванькевіч, прыводзілася лічба ахвяр колькасцю ў 206 500 чалавек, а месца маштабнай трагедыі называлася дваяка: як «фашысцкі лагер смерці Малы Трасцянец» і як «буйнейшы гітлераўскі канцэнтрацыйны лагер смерці – Малы Трасцянец» [4, с. 7].

Такім чынам, базавым палажэннем, замацаваным у беларускай савецкай і захаваным у сучаснай айчыннай гістарыяграфіі, з'яўляецца тэзіс аб масавым знішчэнні ў Трасцянецкім лагеры смерці савецкіх грамадзян, удзельнікаў антыфашысцкай барацьбы і савецкіх ваеннапалонных, а таксама замежных грамадзян агульнай колькасцю 206,5 тыс. чалавек.

У пачатку 2000-х гадоў беларускія гісторыкі прапанавалі новыя падыходы ў дачыненні да вызначэння сутнасці лагера смерці Трасцянец. Так, Э. Р. Іофе, даследуючы пытанне аб лёсе замежных яўрэяў у Трасцянецкім лагеры смерці, звяртае ўвагу на неабходнасць аналізу максімальна поўнай базы дакументальных крыніц, якія могуць сведчыць аб сапраўдных маштабах трагедыі замежных і беларускіх яўрэяў у Трасцянцы. На яго думку, там варта ўзвесці міжнародны мемарыял ахвярам нацызму і фашызму [5, с. 17].

У невялікім навукова-папулярным выданні «Трасцянец» (2003) С. У. Жумар і Р. А. Чарнаглазава уводзяць абагульняючую назву «тэрыторыя смерці», якая стала самым буйным ва Усходняй Еўропе цэнтрам масавай загубы ваеннапалонных, яўрэяў, удзельнікаў руху Супраціўлення, вязняў турмаў і канцэнтрацыйных лагераў, заложнікаў з ліку грамадзянскага насель-

ніцтва, выпадковых сведак злачынстваў нацыстаў і іх памагатых [6, с. 3]. На думку аўтараў выдання, архітэктоніку якога складаюць 27 дакументаў і 49 наглядных матэрыялаў, за 1941–1944 гг. ва ўрочышчах Благаўшчына і Шашкоўка, а таксама ў самім лагеры каля Малога Трасцянца было забіта прыблізна 206 500 чалавек [6, с. 6].

У 2003 г. таксама пабачыў свет зборнік дакументаў і матэрыялаў «Лагер смерці Трасцянец» [7], падрыхтаваны спецыялістамі Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь пад навуковым кіраўніцтвам Г. Д. Кнацько. Заслугай аўтараў-укладальнікаў з'яўляецца тое, што імі былі апублікаваны 117 дакументаў, выяўленых у беларускіх архіўных фондах, з якіх 107 дакументаў упершыню ўводзіліся ў навуковы зварот. Аналіз дакументальнай часткі дазваляе ўбачыць ход падрыхтоўкі матэрыялаў мінскай абласной камісіяй адразу пасля вызвалення, калі на працягу трох тыдняў з канца ліпеня да сярэдзіны жніўня 1944 г. лічбы трагедыі ў раёне Трасцянца прынцыпова змяняліся ў бок значнага памяншэння, пачынаючы ад 546 тысяч, потым да 250 тысяч і ўрэшце да 206,5 тысяч чалавек [7, с. 8]. Апроч дакументальнай часткі ў зборніку прыведзены ўступны гістарычны нарыс, з якога чытач можа скласці ўяўленне аб характары падзей, што мелі месца ў Трасцянцы. Як адзначаюць аўтары, гэта назва аб'ядноўвае некалькі месцаў масавага знішчэння – урочышчы Благаўшчына і Шашкоўка, а таксама лагер побач з вёскай Малы Трасцянец. Аўтары спрабуюць даць навуковую класіфікацыю лагера смерці Трасцянец, які быў тыпавой праявай нацысцкай сістэмы знішчэння. Па іх перакананні, у адным месцы тут пераплялося ўсё тое, што адбывалася ў розных кропках акупаванай Еўропы: знішчэнні грамадзянскага насельніцтва і ваеннапалонных, загадзя спланаванае забойства і непрадказальныя экзекуцыі людзей розных нацыянальнасцей і веравызнання [7, с. 8]. Асабліва важным нам бачыцца сцвярджэнне, што ва ўрочышчы Благаўшчына асобая каманда СД раскапала і спаліла ў лістападзе – снежні 1943 г. (насамрэч з 27.10 да 15.12.1943 г. – *С. Н.)* рэшткі каля ста тысяч чалавек [7, с. 4].

Такім чынам, у пачатку 2000-х гадоў беларускія гісторыкі ўпершыню ўвялі ў шырокі зварот унікальную базу дакументальных крыніц, якая па цяперашні час застаецца па-за межамі спецыяльнага навуковага даследавання аб Трасцянцы як месцы прымусовага ўтрымання і масавага знішчэння насельніцтва Беларусі і іншых краін Еўропы.

Своеасаблівае бачанне месца знішчэння «з міжнароднымі функцыямі» ў раёне Малога Трасцянца прапанавала беларуская даследчыца Т. Р. Вяршыцкая ў артыкуле для энцыклапедыі «Холокост на территории СССР» (2009) [8, с. 987]. Факт стварэння Трасцянецкага лагера смерці яна адлічвае не з восені 1941 г., як гэта прапануе В. П. Раманоўскі, а з мая 1942 г., калі ў раёне Трасцянца быў упершыню цалкам знішчаны транспарт з еўрапейскімі яўрэямі. На яе думку, да канца вайны два ўрочышчы – Благаўшчына і Шашкоўка – з'яўляліся месцамі «систематического уничтожения гражданского населения, в том числе белорусских евреев, пленных из Минска

и окрестностей, а также заключенных и евреев из стран Западной Европы – Австрии, Германии, Польши, Румынии, Чехословакии, Франции» [8, с. 987]. Т. Р. Вяршыцкая падзяляе тэзу нямецкага гісторыка К. Герлаха аб тым, што ў Трасцянцы дакладна ўстанавіць колькасць ахвяр немагчыма, паколькі з кастрычніка 1943 г. зондэркаманда 1005 праводзіла эксгумацыю трупаў з магіл масавага пахавання ва ўрочышчы Благаўшчына і потым спальвала іх. Паводле даных НДзК, прыведзеных у артыкуле Т. Р. Вяршыцкай, усяго ў 34 ямах было пахавана 150 тыс. чалавек.

Працяг навуковага даследавання гісторыі ўрочышча Благаўшчына можна ўбачыць таксама ў артыкуле аўтара гэтых радкоў [9]. У аснову даследчыцкага пошуку пакладзена думка аб неабходнасці новага асэнсавання тых падзей на малавядомых дакументах. Да іх ліку можна аднесці паказанні на пасляваенным судовым працэсе намесніка камандзіра зондэркаманды 1005, оберлейтэнанта Ота Гольдапа – афіцэра ведамства паліцыі бяспекі і службы бяспекі (СД) у Мінску, які на працягу ўсяго тэрміну дзейнасці зондэркаманды з 27 кастрычніка па 15 снежня 1943 г. адказваў за правядзенне работ па эксгумацыі і спальванні целаў забітых. На думку аўтара, якраз матэрыялы судовага працэсу над О. Гольдапам праліваюць святло на агульную лічбу ахвяр колькасцю да 100 тыс. чалавек, эксгуміраваных і спаленых ва ўрочышчы Благаўшчына.

Не ўнеслі прынцыпова важных зменаў у навуковую (размова не ідзе аб унікальных планах мемарыялізацыі. – *С. Н.*) распрацоўку гісторыі ўвогуле і асобных старонак маштабнай трагедыі ў Трасцянцы ў прыватнасці і матэрыялы міжнароднай канферэнцыі «Лагер смерці “Трасцянец” у еўрапейскай памяці» [10], якая ўвесну 2013 г. адбылася ў Мінску з удзелам даследчыкаў з Аўстрыі, Беларусі, Германіі, Чэхіі і прадстаўнічай міжнароднай грамадскасці. Падчас выступленняў былі ўпершыню агучаны лічбы аб катэгорыі ахвяр, знішчаных ва ўрочышчы Благаўшчына. Паводле звестак, прыведзеных беларускім гісторыкам К. І. Козакам, але пры гэтым не пацверджаных ні адной дакументальнай крыніцай, там былі забіты звыш 20 тыс. дэпартаваных яўрэяў з Аўстрыі, Германіі і Чэхаславакіі, каля 60 тыс. савецкіх ваеннапалонных, звыш 50 тыс. яўрэяў з Мінскага гета, каля 15 тыс. вязняў з лагера СД на вуліцы Шырокай і звыш 3 тыс. яўрэяў з іншых куткоў Беларусі [10, S. 15].

Новым словам у айчыннай гістарычнай навуцы ў дачыненні да Трасцянецкага лагера смерці можна лічыць нарыс, падрыхтаваны да зборніка дакументаў і матэрыялаў «Тростенец: трагедия народов Европы, память в Беларуси» (2016) [11]. У ім беларускія гісторыкі А. Я. Далгоўскі і Н. А. Яцкевіч упершыню прыходзяць да важнай навуковай высновы аб тым, што ў Трасцянцы была створана і дзейнічала «сістэма масавага знішчэння», у якую ўваходзілі два ўрочышчы – Благаўшчына і Шашкоўка, былая калгасная адрына як галоўныя месцы масавага знішчэння людзей, а таксама працоўны лагер і ахоўны гарнізон [11, с. 9–11].

У дачыненні да Благаўшчыны аўтары прытрымліваюцца агульнага падыходу, адзначаючы пры гэтым, што з вясны 1942 г. яно стала месцам масавага знішчэння дэпартаваных з краін Еўропы яўрэяў, яўрэяў Мінскага гета, а таксама пагібелі большасці ўдзельнікаў Мінскага антыфашысцкага падполля, іх сем'яў, партызанскіх сувязных, раскрытых і арыштаваных СД, а таксама заложнікаў [11, с. 9]. Датычна ўрочышча Шашкоўка, дзе з канца 1943 г. пачаў дзейнічаць прымітыўны крэматорый (яма-печ), пабудаваны на манер кіеўскага, аўтары нарыса прыходзяць да важнай высновы, што «дадзеная прымітыўная печ ствараласея ў канцы 1943 года як замена месцу масавага знішчэння ў Благаўшчыне». У сувязі з тым, што абсалютная большасць дэпартаваных яўрэяў з Заходняй Еўропы былі знішчаны летам 1942 г., а Мінскае гета перастае існаваць у кастрычніку 1943 г., урочышча Шашкоўка было месцам знішчэння галоўным чынам беларускага насельніцтва. У нарысе адзначаецца, што там загінулі 50 тысяч грамадзян [11, с. 13]. Адным з элементаў «фабрыкі смерці Трасцянца» з'яўлялася калгасная адрына, дзе «29 чэрвеня 1944 года за тры дні да вызвалення Мінска Чырвонай Арміяй па загадзе намесніка каменданта лагера Рыдэра былі расстраляны, а потым спалены 6,5 тыс. чалавек» [11, с. 11].

У выніку чытачу прапануецца наступная выснова: лагер Трасцянец – параджэнне нацысцкай сістэмы эксплуатацыі і знішчэння вялікіх мас людзей розных нацыянальнасцей і веравызнанняў, камбінаваны варыянт месца масавага знішчэння і працоўнага лагера. Тут адбываліся спантанныя і спланаваныя забойствы людзей, а таксама працоўная эксплуатацыя вязняў [11, с. 7]. Важнай з'яўляецца таксама думка аўтараў пра тое, што «работа мінскай абласной камісіі садзейнічання НДзК СССР у значнай ступені вызначыла разуменне Трасцянца ў савецкі час і працягвае з'яўляцца вызначальнай ў гады незалежнасці Беларусі» для рэканструкцыі драматычных падзей каля Малога Трасцянца ў 1942–1944 гг. [11, с. 14].

Такім чынам, толькі з пачаткам XXI ст. беларускія даследчыкі трымаюць у фокусе сваіх навуковых пошукаў гістарычныя падзеі 1942–1944 гг. у раёне Трасцянца, у выніку чаго ў айчыннай гістарыяграфіі былі замацаваны асноўныя палажэнні аб ім як месцы прымусовага ўтрымання і масавага знішчэння людзей агульнай колькасцю 206,5 тыс. чалавек германскімі акупантамі і іх памагатымі.

У германскай гістарыяграфіі тэма Трасцянца з'явілася толькі больш за чвэрць стагоддзя таму, калі берлінскі даследчык П. Коль выдаў працу аб злачынных наступствах дзейнасці вермахта, германскіх службаў паліцыі і СД, спецыяльных падраздзяленняў СС на цэнтральным напрамку наступлення групы армій «Цэнтр», пабудаваную на малавядомых нямецкіх дакументах, успамінах савецкіх відавочцаў і матэрыялах пасляваенных судовых працэсаў над нацысцкімі злачынцамі. Важным для айчыннага чытача можна лічыць тое, што ў дачыненні да Трасцянца нямецкі даследчык праз назву «беларускі Асвенцім» [12, S. 91] упершыню ўключае месца

масавага знішчэння не толькі ў пералік малавядомых тэм навуковага пошуку, але і ставіць яго побач з іншымі месцамі масавых забойстваў у агульна-еўрапейскі пантэон памяці.

Другі нямецкі гісторык, К. Герлах, аўтар фундаментальнага даследавання пра германскую акупацыйную палітыку і палітыку знішчэння ў Беларусі 1941– 1944 гг. [13], аб'ядноўвае месцы масавага знішчэння ў раёне Трасцянца і выкарыстоўвае ў якасці назвы тэрмін «лагер смерці» (Todeslager). Агульная лічба ахвяр, у тым ліку дэпартаваных яўрэяў з Аўстрыі, Германіі і Чэхаславакіі, пахаваных ва ўрочышчы Благаўшчына, складала ад 40 да 50 тыс. чалавек. Заўважым, што нямецкі даследчык пагаджаецца з лічбай ахвяр, знішчаных у калгаснай адрыне ў канцы чэрвеня 1944 г., але агульнай лічыць колькасць ахвяр «каля 60 тысяч чалавек», выкарыстоўваючы пры гэтым агаворку «па грубых падліках» [13, S. 770]. Трыма гадамі пазней П. Коль у спецыяльным даследаванні «Лагер смерці Трасцянец: сведчанні відавочцаў і дакументы» не пагаджаецца з гэтай лічбай, пакідаючы пры гэтым агульнапрынятую колькасць ахвяр у 206,5 тыс. чалавек і адзначаючы факт таго, што «лагер смерці Трацянец з'яўляўся самым вялікім месцам масавых забойстваў на тэрыторыі Беларусі ў гады германскай акупацыі 1941–1944 гг.» [14, S. 21].

Важны ўклад у сучасную германскую гістарыяграфію па даследаванні гісторыі Трасцянца ўносіць нямецкі гісторык П. Рэнтрап, якая ў другой палове нулявых гадоў даследавала гісторыю нацысцкіх злачынстваў у Беларусі, абраўшы ў якасці тэмы доктарскай дысертацыі Мінскае гета і Малы Трасцянец [15; 16]. У навуковым артыкуле «Малы Трасцянец» (2009) яна сцвярджае, што толькі з вясны 1942 г. камандзір мінскай службы бяспекі Э. Штраўх пачаў стварэнне новага цэнтра масавага знішчэння, якім па прычыне адступлення вермахта на цэнтральным фронце замест Магілёва на Дняпры становіцца Малы Трасцянец пад Мінскам [15, S. 574]. Да восені 1943 г. цэнтральным месцам нацысцкіх забойстваў, як адзначае даследчыца, з'яўлялася ўрочышча Благаўшчына, дзе было знішчана ад 40 да 55 тыс. ахвяр. На яе думку, афіцыйная лічба, якая ўжываецца ў сучаснай беларускай гістарыяграфіі ў дачыненні да агульнай колькасці ахвяр у гэтым урочышчы, значна завышана [15, S. 578].

У сваёй манаграфіі, якая пабачыла свет у 2011 г., аўтар не выкарыстоўвае абагульненую назву Трасцянец, а згадвае канкрэтныя месцы трагедыі – працоўны лагер Малы Трасцянец і месцы масавага знішчэння Благаўшчыну, Шашкоўку, адрыну на краі вёскі. Даследчыца ставіць пад сумненне факт правядзення ў Благаўшчыне расстрэлаў неяўрэйскага насельніцтва і савецкіх ваеннапалонных ужо з восені 1941 г. Са спасылкай на дакументальныя крыніцы яна паказвае, што для стварэння і функцыянавання такога месца, а таксама правядзення маштабных расстрэлаў за рысай горада пачынаючы з восені 1941 г. неабходна было поўнае ўкамплектаванне штатам сіл мінскай паліцыі бяспекі і СД. Працоўны лагер быў створаны на ўскраіне вёскі Малы Трасцянец (на тэрыторыі былога калгаса імя Карла

Маркса) у канцы красавіка 1942 г. Падчас першага расстрэлу ў Благаўшчыне, які адбыўся 11 мая, былі знішчаны каля 1 тыс. яўрэяў з Вены (Аўстрыя). Новай нам бачыцца думка даследчыцы пра тое, што аднаўленне дэпартацыі еўрапейскіх яўрэяў у напрамку Мінска з'яўлялася вызначальнай умовай для стварэння месца знішчэння ў Благаўшчыне. З мая па кастрычнік 1942 г. у Мінск і Малы Трасцянец (праз станцыю Калодзішчы. – *С. Н.*) прыбылі 16 эшалонаў з дэпартаванымі яўрэямі з Вены, Тэрэзіенштадта, Кёнігсберга і Кёльна [16, S. 203]. З амаль 23 тысяч дэпартаваных у Мінск і Малы Трасцянец удалося застацца ў жывых толькі 75 чалавекам. П. Рэнтрап прыходзіць да высновы, што агульная колькасць людзей, знішчаных у раёне Малога Трасцянца, складае значна менш за 60 тыс. чалавек, з якіх у Благаўшчыне было забіта больш за 30 тыс. [15, S. 211]. Пры гэтым аўтар адзначае, што К. Герлах бяздоказна прымае афіцыйную лічбу ў 6 500 ахвяр, знішчаных у адрыне на краі вёскі ў чэрвені 1944 г. Па перакананні Рэнтрап, лічба гэта павінна быць меншай. Аднак дакладныя даныя атрымаць немагчыма [16, S. 227]. Асабліва важнай у працы П. Рэнтрап з'яўляецца класіфікацыя гэтага месца нацысцкіх злачынстваў: Малы Трасцянец займаў прамежкавае становішча паміж месцам масавага знішчэння і лагерам смерці.

У гэтай сувязі важна звярнуцца да навуковых крытэрыяў, на аснове якіх беларускія і нямецкія даследчыкі робяць спробы навуковай класіфікацыі нацысцкіх месцаў тэрору ўвогуле і месцаў масавага знішчэння людзей у раёне вёсак Малы і Вялікі Трасцянец у прыватнасці. Паводле айчыннай навуковай класіфікацыі месцаў прымусовага ўтрымання грамадзянскага насельніцтва на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў 1941–1944 гг. [17], да іх асноўных тыпаў адносяцца: канцэнтрацыйныя лагеры, лагеры знішчэння, выпраўленча-працоўныя лагеры, гета, турмы, лагеры каля пярэдняга краю нямецкай абароны, працоўныя (рабочыя) лагеры, перасыльныя лагеры, лагеры грамадзянскага насельніцтва, рабочыя калоны (батальёны, роты, каманды) [17, с. 6–7]. Зварот да нямецкай навуковай класіфікацыі вызначае такія месцы прымусовага ўтрымання грамадзян і іх масавага знішчэння, як канцэнтрацыйныя лагеры, выхаваўчыя працоўныя лагеры, рабочыя лагеры, турмы, лагеры для ваеннапалонных, гета, працоўныя лагеры для яўрэяў, лагеры смерці, лагеры для цыган. На думку кіраўніка Цэнтра па даследаванні антысемітызму пры Берлінскім тэхнічным універсітэце прафесара Вольфганга Бенца, «у Беларусі лагер Малы Трасцянец, створаны ў пачатку 1942 г. камандзірам паліцыі бяспекі і СД Мінска, прайшоў шлях ад рабочага лагера да цэнтральнага месца знішчэння, у якім да лета 1944 г. былі забіты не менш за 60 тыс. чалавек, у тым ліку немцы, чэхі і аўстрыйцы, а таксам савецкія ваеннапалонныя і ўдзельнікі Супраціўлення» [18, S. 24].

Вынікае, што Трасцянец падпадае пад крытэрыі айчыннай і нямецкай класіфікацыі ў дачыненні да рабочага лагера як месца прымусовага ўтрымання грамадзянскага насельніцтва. Гэта азначае, што ў апошнія гады беларускія і нямецкія гісторыкі вялі пошук новых падыходаў у дачыненні да вызначэння навуковага характару месцаў масавага генацыду ў раёне

Трасцянца, спрабуючы зрабіць гэта на новай дакументальнай базе, выявіць сапраўдны характар тых гістарычных падзей у кантэксце стварэння мемарыяльнага комплексу «Трасцянец» – сучаснага помніка агульнаеўрапейскага значэння [19].

Такім чынам, аўтар гэтых радкоў прапаноўвае зыходзіць з таго відавочнага факта, што мемарыяльны комплекс «Трасцянец» – гэта месца ўшанавання памяці не толькі яўрэяў з Мінскага гета і краін Цэнтральнай і Заходняй Еўропы, але тысяч беларускіх партызан і падпольшчыкаў, савецкіх ваеннапалонных, грамадзян з розных куткоў Беларусі. На нашу думку, найбольш трапнай будзе абагульненая назва Трасцянец як месца прымусовага ўтрымання і масавага знішчэння людзей з Беларусі і іншых краін Еўропы.

Адным з важнейшых вынікаў аўтарскага даследавання стала выяўленне і ўвядзенне ў шырокі ўжытак значнага комплексу дакументальных крыніц. Гэта ставіць на парадак дня сучаснай беларускай гістарыяграфіі задачу па спецыяльным вывучэнні гэтай тэмы з улікам дасягненняў навейшай тэорыі і метадалогіі, асабліва кампаратыўнага аналізу айчынных і замежных крыніц з мэтай атрымання новых навуковых ведаў.

## ЛІТАРАТУРА

1. *Раманоўскі, В. П.* Трасцянецкі лагер смерці / В. П. Раманоўскі // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне, 1941–1945: энцыкл. / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.[. – Мінск : БелСЭ, 1990. – 680 с.

2. *Романовский, В. Ф.* Немецко-фашистская оккупационная политики и ее крах в Белоруссии (1941–1944 гг.): дис. … д-ра ист. наук: 07.00.02 / В. Ф Романовский // Ин-т истории АН БССР. – Минск, 1974. – 342 л.

3. Акт минской областной комиссии о массовом истреблении советских граждан на территории гор. Минска и его окрестностей немецко-фашистскими захватчиками в 1941–1944 гг. от 13 августа 1944 г. // Преступления немецко-фашистских захватчиков в Белоруссии. 1941–1944 гг. – Минск : Беларусь, 1965. – С. 222–227.

4. *Ванькевич, А. Г.* Экскурсия в Тростенец / А. Г. Ванькевич. – Минск : Полымя, 1986. – 32 с.

5. *Иоффе, Э. Г.* Иностранные евреи в Тростенецком лагере смерти / Э. Г. Иоффе. – Минск : НАРБ, 2000. – 28 с.

6. Тростенец / сост. С. В. Жумарь, Р. А. Черноглазова. – Минск : ГК «Полиграфоформление», 2003. – 103 с.

7. Лагерь смерти Тростенец. Документы и материалы / сост. В. И. Адамушко [и др.]; под ред. Г. Д. Кнатько. – Минск : НАРБ, 2003. – 292 с.

8. *Вершицкая, Т.Г.* Тростенец / Т. Г. Вершицкая // Холокост на территории СССР: энцикл. / гл. ред. И. А. Альтман. – М.: РОССПЭН. – С. 987.

9. *Новікаў, С.* Урочышча Благаўшчына – месца масавага знішчэння людзей на тэрыторыі Беларусі / С. Новікаў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2013. – № 10. – С. 21–27.

10. Der Vernichtungsort Trostenez in der europäischen Erinnerung. Materialien zur Internationalen Konferenz vom 21.–24. März 2013 in Minsk. – Dortmund : IBB, 2013. – 61 S.
11. Тростенец: трагедия народов Европы, память в Беларуси : документы и материалы / сост.: В. И. Адамушко [и др.].; редкол.: В. В. Андриевич (гл. ред.) [и др.]. – Минск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2016. – 520 с.
12. *Kohl, P.* „Ich wundre mich, dass ich noch lebe“. Sowjetische Augenzeugen berichten / P. Kohl. – Guetersloh: Guetersloher Verlag, 1990. – 319 S.
13. *Gerlach, Ch.* Kalkulierte Morde. Die deutsche Wirtschafts- und Vernichtungspolitik in Weissrussland 1941 bis 1944 / Ch. Gerlach. – Hamburg: Hamburger Edition, 1999. – 1232 S.
14. *Kohl, P.* Das Vernichtungslager Trostenez: Augenzeugenberichte und Dokumente / P. Kohl. – Dortmund: Internationales Bildungs- und Begegnugswerk GmbH, 2003. – 111 S.
15. *Rentrop, P.* Maly Trostinez / P. Rentrop // Der Ort des Terrors. Geschichte der nationalsozialistischen Konzentrationslager: in 9 Bd. – München : Verlag C.H. Beck oHG, 2009. – Bd. 9: Die Organisation des Terrors. – 2. Aufl. – S. 573–587.
16. *Rentrop, P.* Tatorte der „Endlösung“. Das Ghetto Minsk und die Vernichtungsstätte von Maly Trostinez / P. Rentrop. – Berlin : METROPOL, 2011. – 256 S.
17. Справочник места принудительного содержания гражданского населения на оккупированной территории Беларуси 1941–1944 / авт.-сост. В. И. Адамушко [и др.]; науч. ред. Р. П. Платонов, В. И. Адамушко. – Минск : НАРБ, 2011. – 158 с.
18. *Benz, W.* Nationalsozialistische Zwangslager. Ein Überblick / W. Benz // Der Ort des Terrors. Geschichte der nationalsozialistischen Konzentrationslager: in 9 Bd. – München : Verlag C.H. Beck oHG, 2006. – Bd. I: Die Organisation des Terrors. – 2 Aufl. – 394 S.
19. Vernichtungsort Malyj Trostenez. Geschichte und Erinnerung. Katalog der deutsch-belarussischen Wanderausstellung. – Berlin : IBB Dortmung, IBB Minsk, 2016. – 246 S.

*Поступила в редакцию 21.02.17*